**ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ**
**па правядзенні выбараў**
**у Каардынацыйную Раду III склікання**

# РАШЭННЕ

аб выключэнні кандыдата са спісу выбарчага суб’екта
і ўнясенні зменаў у Пастанову аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб’ектаў

2 траўня 2024 года г. Варшава

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду III склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай, разглядзеўшы ліст ад выбрачага суб’екта “Аб’яднанне палітычных партый Народная Грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя “Салідарнасць”,

## ВЫЗНАЧЫЛА:

2 траўня 2024 года ў Выбарчую камісію паступіў ліст ад ініцыятара спісу кандыдатаў выбарчага суб’екта “Аб’яднанне палітычных партый Народная Грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя “Салідарнасць” Георгія Дзмітрука, у якім утрымліваецца просьба выключыць са спісу выбарчага суб’екта кандыдата Вольгу Тышкевіч з прычыны “*прыпынення яе ўдзелу ў спісе Салідарнасць*”.

Выбарчая камісія, прааналізаваўшы раней пададзеныя дакументы, прыходзіць да наступных высноваў наконт таго, што меў на ўвазе Георгій Дзмітрук у сваім паведамленні:

1) Пад спісам “Салідарнасць” належыць разумець выбарчы суб’ект “Аб’яднанне палітычных партый Народная Грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя “Салідарнасць”;
2) Пад “прыпыненнем удзелу ў спісе” належыць разумець, што кандыдат **выбыў** са спісу выбарчага суб’екта;
3) Пад Вольгай Тышкевіч належыць разумець спадарыню **ЦІШКЕВІЧ**, пазначаную ў спісе кандыдатаў выбарчага суб’екта як “Tsishkevich Olga” пад нумарам 10.

У адпаведнасці з пп. 7.1 пункта 7 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года, 7.1., калі пасля завяршэння

рэгістрацыі з спіса выбарчага суб’екта выбывае кандыдат, выбарчы суб’ект павінен паведаміць аб гэтым у Камісію з цягам 1 дня. Паколькі кандыдат “Tsishkevich Olga” выбыла са спіса выбарчага суб’екта “Аб’яднанне палітычных партый Народная Грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя “Салідарнасць”, дадзены кандыдат мусіць быць выключаны са спісу.

На падставе вышэй выкладзенага, Выбарчай камісіяй

**ВЫРАШАНА:**

Кандыдата спіса выбарчага суб’екта “Аб’яднанне палітычных партый Народная Грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя “Салідарнасць” “Tsishkevich Olga” пад нумарам 10 - са спісу выключыць.

Унесці адпаведныя змяненні ў Пастанову аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб’ектаў ад 25 красавіка 2024 года; спіс кандыдатаў прывесці ў адпаведнасць з патрабаваннямі Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года.

Старшыня Выбарчай камісіі А. Прыходзька

